Дзяржаўная установа адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г.Ліды”
Бібліятэка



# Творчая арбіта Андрэя Макаёнка

*беларускага драматурга і перакладчыка*

12 лістапада 2020 года

**100 гадоў з дня нараджэння**
























Творчасць Андрэя Ягоравіча Макаёнка (1920–1982) – драматурга, сцэнарыста, перакладчыка, грамадскага дзеяча – адна з самых яркіх старонак у гісторыі беларускай літаратуры. Яго п’есы, дынамічныя, вострасюжэтныя, насычаныя сакавітым гумарам, заўсёды выклікалі павышаную цікавасць тэатральных калектываў і гледачоў, праўдзіва і ярка адлюстроўвалі жыццё народа.

Андрэй Ягоравіч Макаёнак нарадзіўся 12 лістапада 1920 года ў вёсцы Борхаў Рагачоўскага раёна. Сярэднюю школу скончыў у суседніх Журавічах, быў адным з лепшых вучняў. Менавіта у школьныя гады праявілася цікавасць юнака да будучай справы жыцця, яскрава раскрыліся артыстычныя здольнасці. Ён з задавальненнем дэкламаваў на школьнай сцэне гумарыстычныя вершы і байкі, удзельнічаў у шматлікіх сцэнках. Пасля школы ён нават зрабіў спробу паступіць у Маскоўскі інстытут кінематаграфіі, але не прайшоў па конкурсе.

Восенню 1939 года, калі будучы драматург вучыўся ў педагагічным тэхнікуме ў Рагачове, пачалася вайна. Макаёнак быў прызваны на ваенную службу. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у савецка-англійскай аперацыі ў Іране, баях на

Паўночным Каўказе і на Крымскім фронце, дзе быў цяжка паранены – яму нават пагражала ампутацыя абедзвюх ног. На шчасце, Макаёнак быў своечасова эвакуяваны. У 1942 годзе ён быў прызнаны непрыгодным для службы ў войску і некаторы час працаваў ваенруком у Грузіі.

Зімой 1943 г. вярнуўся на радзіму. Пасля вяртання працаваў у школе, далей – у райкоме гродзенскага камсамола, дзе ён быў прызначаны другім сакратаром гаркома.

Але ў Гродна Макаёнак пражыў нядоўга – перабраўся бліжэй да сям'і ў Магілёў, дзе працаваў простым рабочым на чыгуначным вузле.

Затым на працягу года Макаёнак быў памочнікам сакратара Журавіцкага райкома партыі. Крытыкі сцвярджаюць, што менавіта

гэта пасада моцна паўплывала на яго творчасць, таму што там будучы драматург мог бачыць усе праблемы, якія паўставалі перад людзьмі таго часу.

Давялося Макаёнку працаваць і народным суддзёй, але юрыдычная справа яму, да таго ж не меўшаму адпаведнай адукацыі, вельмі не падабалася, таму Макаёнак неўзабаве паступіў у Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ. Але пасля заканчэння на партыйную работу не ўладкаваўся.
З 1970-х гг. выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага савета БССР. У 1965 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у сесіі Генеральнай асамблеі ААН.

Актыўная літаратурная творчасць Андрэя Макаёнка пачалася з ваенных дзённікаў, замалёвак, псіхалагічных абразкоў і эцюдаў, сцэнак і нататкаў, а таксама з гумарэсак і фельетонаў для часопіса "Вожык".

Упершыню выступіў у друку ў 1946 г. з аднаактавай п'есай "Добра, калі добра канчаецца". Твор быў адзначаны дыпломам і прэміяй на рэспубліканскім конкурсе. Першай сур'ёзнай спробай А. Макаёнка ў драматургіі з'явілася п'еса "На досвітку" (1951), спектакль па якой быў пастаўлены ў тэатры імя Я. Купалы. У 1953 г. была напісана вострая, выкрывальная сатырычная камедыя "Выбачайце, калі ласка!". П'еса была пастаўлена беларускімі тэатрамі імя Я. Коласа (1953) і імя Я. Купалы (1954), а таксама больш як 200 тэатрамі па-за межамі Беларусі.

У сатырычных камедыях "Каб людзі не журыліся" (1958) і "Лявоніха на арбіце" (1961, Літаратурная прэмія імя Я. Купалы) драматург раскрываў праблемы вясковай рэчаіснасці, паказваў людзей з абывацельскай псіхалогіяй. Амаль дзесяць гадоў А. Макаёнак не прапаноўваў тэатрам новых п'ес, шукаў новыя сродкі сцэнічнай выразнасці. У выніку напружаных пошукаў узніклі трагікамедыі "Зацюканы апостал" (1969), "Трыбунал" (1970), "Пагарэльцы" (1980). Спектаклі доўгі час з поспехам ставіліся на

сцэнах айчынных і замежных тэатраў. У 1974 г. А. Макаёнак за п’есы “Трыбунал” і “Таблетку пад язык” быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Я. Коласа, а ў 1977 г. – удастоены звання народнага пісьменніка.

Усе п’есы драматурга вызначаюцца арыгінальнасцю формы і зместу, у іх узнімаюцца балючыя сацыяльна-маральныя праблемы жыцця, якія і па сённяшні дзень гучаць актуальна.

Пяру А. Макаёнка належаць пераклады многіх п’ес: “Дабракі” Л. Зорына, “Блакада” У. Іванова, “Чацвёрты” К. Сіманава і інш.
Андрэй Макаёнак – аўтар кінааповесці «Твой хлеб» (1956), кінасцэнарыяў мастацкіх фільмаў «Шчасце трэба берагчы» (па матывах аповесці А. Кулакоўскага «Нявестка», 1958), «Рагаты бастыён» (па п’есе «Лявоніха на арбіце», 1964), «Пасля кірмашу» (па матывах п’есы Янкі Купалы «Паўлінка», 1972), дакументальных фільмаў «У адзінай сям’і» (1957), «Кандрат Крапіва» (1961).

А. Я. Макаёнак узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі і шматлікімі медалямі, а таксама званнем «Народны пісьменнік БССР». Макаёнак з'яўляецца лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа.

Андрэй Макаёнак быў мастаком яркага, непаўторнага таленту. Ён творча развіў многія жанравыя традыцыі беларускай драматургіі, узняў узровень айчыннай камедыяграфіі да лепшых сусветных узораў.

Імем Андрэя Макаёнка названы вуліцы ў Мінску і Гомелі, а на радзіме, у Журавічах, у 1982 годзе ў гонар народнага пісьменніка адкрыты помнік. Імя А. Макаёнка прысвоена Гродзенскай цэнтральнай бібліятэцы і Журавіцкай сярэдняй школе Рагачоўскага раёна.